


# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.54 | 19.09 | 12.15 |
| Віцебск — | 6.44 | 18.59 | 12.15 |
| Магілёў — | 6.44 | 18.59 | 12.15 |
| Гомель — | 6.41 | 18.56 | 12.15 |
| Гродна — | 7.10 | 19.25 | 12.15 |
| Брэст — | 7.11 | 19.25 | 12.14 |

## Месяц

*Першая квадра ў 22.31. Месяц у сузор'і Казярога.*

## Імяніны

***Пр.** Ганны, Аляксея, Васіля, Захара, Іосіфа, Мікіты, Рыгора, Сяргея, Феафана, Фядоса, Харытона, Якіма.*
***К.** Маўрыцыя, Тамаша.*



Фота Лізаветы ГОЛАД.

# ЗАЎТРА




## Запрашальнік

# У Карэлічах пройдзе кніжны фестываль

**Традыцыяй стала правядзенне ў Карэліцкім раёне, на Гродзеншчыне, свята кнігі. Вось і сёлета, 28 верасня, на плошчы 17 Верасня ў гарадскім пасёлку Карэлічы па традыцыі збяруцца бібліятэкары, пісьменнікі, кнігавыдаўцы і проста аматары чытання. Звычайна на фестываль «ПРОдвижение книги. Библиотечные ступени» прыязджаюць і бібліятэкары з суседніх раёнаў іншых абласцей — Брэсцкай і Мінскай. Такі ж удзел чакаецца і на IV Міжрэгіянальным фестывалі, галоўным арганізатарам якога выступае дзяржаўная ўстанова культуры «Карэліцкая раённая бібліятэка».**

Сярод гасцей і актыўных прапагандыстаў кнігі, чытання на фестывалі — Выдавецкі дом «Звязда», які не ўпершыню арганізоўвае ў Карэліцкім раёне розныя сустрэчы з пісьменнікамі. Вось і сёлета «Звязда» наведаецца ў гэтае славутае паселішча Гродзеншчыны разам з паэтамі і празаікамі, чые кнігі зусім нядаўна ўбачылі свет. Будуць арганізаваны аўтограф-сесіі. Кожны жадаючы зможа набыць кнігі Кацярыны Хадасевіч-Лісавой, Міколы Чарняўскага, Іны Фраловай, Ірыны Карнавухавай, Паўла Гушынца, Дзмітрыя Нікалаева, Вікторa Шніпа...

Карэліцкі край — багатая на пісьменніцкія таленты старонка. З Карэлічамі і іх ваколіцамі звязаны творчыя, жыццёвыя лёсы народнага пісьменніка Беларусі Янкі Брыля, літаратуразнаўца Уладзіміра Калесніка, празаіка і літаратурнага крытыка Уладзіміра Навумовіча, паэтаў Пятра Ламана, Міколы Бусько і іншых. Добрай традыцыяй было і правядзенне на тэрыторыі раёна свята «Кніжныя сустрэчы ў Мірскім замку» (яно праходзіла ў 2019 — 2020 гг.).

**Максім ПЯСЧАНСКІ.**

## Надвор'е

# РАЗВІТАЛЬНЫ АКОРД ЛЕТА

### На выхадныя — да 28 цяпла

**Быццам бы трэцяя дэкада верасня, а ў нас на двары сярэднясутачная тэмпература паветра на 6—10 градусаў вышэйшая, чым звычайна. У канцы тыдня чакаюцца паступленні вельмі цёплых паветраных мас з Балканскага паўвострава. Пераважна ў паўднёвай частцы краіны паветра прагрэецца да 26—28 градусаў. У дзённыя гадзіны па краіне чакаецца месцамі моцны парывісты вецер, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

У суботу ўначы месцамі па захадзе краіны пройдзе кароткачасовы дождж. Раніцай і днём з тэрыторыі Польшчы пачне перамяшчацца франтальны раздзел, які прынясе на заходнюю палову краіны кароткачасовыя дажджы, а ў асобных раёны — навальніцы і моцны парывісты вецер. Тэмпература паветра ўначы дасягне 11—18 градусаў, а ўдзень — 21—28 цяпла.

У нядзелю тэрыторыя краіны будзе знаходзіцца пад уплывам кантраснага атмасфернага фронту, услед за якім пачнуць паступаць халодныя паветраныя масы з Балтыйскага мора. На большай частцы тэрыторыі краіны прагназуюцца дажджы, ноччу месцамі моцныя. У асобных раёнах навальніцы, днём месцамі моцны парывісты вецер. Тэмпература паветра ўначы будзе ў межах ад плюс 12 да 18 градусаў, а днём у паўночна-заходніх і цэнтральных раёнах — ад 16 да 23 градусаў вышэй за нуль. Па паўднёвым усходзе тэмпература павысіцца да 24—28 градусаў.

У пачатку наступнага тыдня асноўным фактарам стане заходнееўрапейскі антыцыклон. Паводле інфармацыі сіноптыкаў, у краіне зноў усталюецца сухое надвор'е. Хоць тэмпература паніззіцца, яна па-ранейшаму будзе перавышаць кліматычную норму на 2—5 градусаў.

З панядзелка да серады апады ў асноўным не прагназуюцца, толькі ў панядзелак па паўднёвым усходзе захаваецца ўплыў франтальнага раздзелу, які адступае на Расію. У панядзелак ноччу чакаецца 6—13 градусаў, а па паўднёвым усходзе — да плюс 16 градусаў. Днём тэмпература паветра будзе ў межах ад 17 да 23 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Даты | Падзеі | Людзі

### 22 ВЕРАСНЯ

У краіне

**1903** год — нарадзіўся Хвядос Сяргеевіч Шынклер, беларускі пісьменнік. Працаваў у рэдакцыях раённых газет у Бабруйску і Жлобіне, у газеце «Літаратура і мастацтва», часопісе «Полымя рэвалюцыі». Быў членам літаратурнага аб'яднання «Маладняк». Адным з першых у беларускай літаратуры звярнуўся да тэмы рабочага класа, паказваў новыя, інтэрнацыянальныя адносіны сярод людзей. Аўтар зборніка апавяданняў «Стрэлачнік Мігай», аповесцяў «Сонца пад шпалы», «Пульс жыцця» і іншага. Пісаў п'есы, аповесці для дзяцей, рэцэнзіі, артыкулы, нарысы. Загінуў на фронце ў 1942-м пад Сталінградам.

**1938** год — нарадзіўся Мікалай Ільясавіч Азаматаў, дзяржаўны дзеяч Беларусі, заслужаны работнік прамысловасці Беларусі. Працаваў на інжынерных і кіруючых пасадах на прамысловых прадпрыемствах і ў навукова-даследчых інстытутах Беларусі. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі.

**1943** год — мінскія падпольшчыкі (Алена Мазанік, Марыя Осіпава, Надзея Траян) знішчылі генеральнага камісара Беларусі гаўляйтара Вільгельма Кубэ.



У свеце

**1803** год — нарадзіўся Сяргей Аляксандравіч Сабалеўскі, рускі паэт. Аўтар эпіграм, бібліёграф; выдавец твораў Аляксандра Пушкіна і папулярызатар яго творчасці.

**1908** год — у Вяліка-Тырнава быў абвешчаны маніфест аб незалежнасці Балгарыі ад Асманскай імперыі.

**1938** год — нарадзіўся Дзін Рыд, амерыканскі спявак, акцёр і рэжысёр (з 1972-га жыў у ГДР).



**1973** год — нарадзілася Марыя Андрэеўна Галубкіна, расійская актрыса тэатра і кіно. Здымалася ў фільмах «Рабро Адама», «Француз», «Вясковая камедыя» і іншых.

Так гаварыў...

**ІАГАН ГЁТЭ:**

*«Сапраўдная дабрачыннасць ніколі не азіраецца на свой цень — на славу».*

УНП 100088694.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ

ЗАО «Возвышенность»

**Внеочередное общее собрание акционеров ЗАО «ВОЗВЫШЕННОСТЬ» переносится с 25 сентября 2023 г. на 10 октября 2023 г. в 11.00 по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, улица Сторожевская, д. 8, со следующей повесткой дня:**

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. О заключении ЗАО «Возвышенность» с ЗАО «Альфа-Банк» Договора поручительства № 2023-241/01 (сделка с аффилированным лицом).
2. Одобрение ЗАО «Возвышенность» существенных условий Договора поручительства № 2023-241/01.
3. О предоставлении полномочий на заключение (подписание) от имени ЗАО «Возвышенность» Договора поручительства № 2023-241/01 с ЗАО «Альфа-Банк».
4. О досрочном прекращении полномочий члена Наблюдательного совета ЗАО «Возвышенность».
5. Об избрании нового члена Наблюдательного совета ЗАО «Возвышенность».

Органом, созывающим внеочередное собрание акционеров, является Наблюдательный совет и акционер ЗАО «Возвышенность».

С документами, относящимися к повестке дня, можно ознакомиться по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, улица Сторожевская, д. 8 с 09.00 до 18.00 ежедневно, кроме субботы, воскресенья и праздничных дней с предварительным телефонным уведомлением.

Форма проведения собрания: очная. Форма голосования по всем вопросам повестки дня: прямая, открытая, карточками, изготовленными из бумаги с указанием количества голосов.

Список лиц, имеющих право участие в Собрании, составляется на 01.09.2023 года.

Регистрация лиц, имеющих право на участие в Общем собрании участников Общества, будет проводиться с 10.00 до 10.50 в день и по месту проведения Собрания. При регистрации участники обязаны предъявить паспорт или иной документ, удостоверяющий личность. Представители участников обязаны при регистрации предъявить паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, а также доверенность, удостоверенную в установленном законодательством порядке.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета надрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 10.457. Індэкс 63850. Зак. № 2241.

Нумар падпісаны ў 19.30 21 верасня 2023 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12